міфалагічнай свядомасці, перакануўча сцвярджаюць асаблівую мадэль рэчаіснасці, якую здолеў стварыць М. Багдановіч у вершаваным цыкле "У зачараваным царстве".

Узнёслы лірызм у апісаннях беларускай прыроды ў вершах М. Багдановіча спалучаецца з дэманалагічным каларытам і фантастыкай, якія абапіраюцца на айчынны фальклор і міфалогію. Свае дбайныя адносіны да народных вытокаў тэарэтык і практык беларускай літаратуры дакладна дэклараваў у артыкуле "Забыты шлях": "Думаецца, пакуль мы робім першыя крокі, трэба нам трымацца народнай песні, як сляпы трымаецца плота" [1]. Вядома, што міфалагічныя матывы і вобразы выконваюць ролю нагляднага, багатага значэннямі прыкладу. Падобную думку М. Багдановіч выказвае ў эпіграфе да загалоўнага верша "У зачараваным царстве", цытуючы радкі Дантэ: "О вы, разумныя, зірніце самі, / І кожны настаўленне зразумее, / Схаванае за дзіўнымі радкамі". Сапраўды, паэт даводзіць да сучаснікаў сваё настаўленне аб распрацаванасці "дзіўных радкоў", багатым арсенале беларускіх фальклорна-міфалагічных матываў і падштурхоўвае да актыўнага выкарыстання гэтых рэсурсаў міфатворчай народна-паэтычнай свядомасці ў літаратурных творах новай беларускай літаратуры, каб гэтыя рэсурсы ўмацавалі разуменне ўласнай беларускай этнічнай ідэнтычнасці.

Такім чынам, вывучэнне фальклорна-міфалагічных матываў як складанага адзінства ідэйна-тэматычных, аксіялагічных і фармальна-стылістычных аспектаў у крытычных артыкулах і мастацкіх творах М. Багдановіча дазваляе ўсвядоміць важныя нюансы не толькі мастацкай манеры паэта, але і канстантныя рысы нацыяментальнай сферы беларускай літаратуры і культуры.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Багдановіч, М. Забыты шлях [Электронны рэсурс] / М. Багдановіч. – Рэжым доступу: https://www.maksimbogdanovich.ru/ stories/236.htm. – Дата доступу: 12.10.2020.

2. Багдановіч, М. В. Самийленко [Электронны рэсурс] / М. Багдановіч. – Рэжым доступу: https://www.maksimbogdanovich.ru/ stories/239.htm. – Дата доступу: 27.09.2020.

3. Бельскі, А. І. Сучасная беларуская літаратура: станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80–90-я гг.) : дапам. для настаўнікаў / А. І. Бельскі. – Мінск : Нар. асвета, 1997. – 254 с.

4. Веселовский, А. Н. Историческая поэтика / А. Н. Веселовский. – Л. : Худож. лит., 1940. – 596 с.

**Я. Р. Самуйлік**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт

## РЭЛІГІЙНАЯ ЛІТАРАТУРА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У XVI СТ.

У ВКЛ старабеларуская мова выкарыстоўвалася ў наддыялектных пісьмовых зносінах на тэрыторыі ўсёй краіны. Гэтая мова мела статус афіцыйнай, дзяржаўнай у ВКЛ, таму ўжывалася ва ўсіх сферах грамадскага

жыцця. Аднак у дыпламатычнай перапісцы з іншымі дзяржавамі на Беларусі, як і ва ўсёй Еўропе, карысталіся лацінскай мовай, а ў дачыненнях з суседнімі краінамі гэтую ролю выконвала старабеларуская мова. У самім Княстве беларуская мова была мовай не толькі большай часткі насельніцтва названай дзяржавы – літвінаў[1] (пражывалі на асноўнай тэрыторыі краіны), не толькі дзяржаўнай (што замацавана ў Статуце ВКЛ[2]), але і мовай міжэтнічных зносін. Ёю карысталіся беларусы, украінцы, жамойты (цяперашнія літоўцы), яўрэі, татары, рускія стараверы, немцы, цыганы. У часы Сярэднявечча, напрыклад, Малдова і Валахія[3] ў дыпламатычнай перапісцы карысталіся афіцыйнай мовай ВКЛ (г. зн. старабеларускай). Ведалі беларускую мову і карысталіся ёю людзі з маскоўскага Пасольскага прыказу, службоўцы канцылярыі нямецкага вялікага магістра з Рыгі. Пасля таго як каралём Польшчы ў 1386 г. стаў вялікі князь ВКЛ Ягайла, у значнай ступені беларускамоўным зрабіўся кракаўскі каралеўскі двор. Паказальна, што ў 1392–1393 гг. нават хан Залатой Арды Тахтамыш піша ліст Ягайлу на старабеларускай мове. Польская і руская сталіцы вялі перапіску паміж сабой па-беларуску. Калі ў 1646 г. польскія дыпламаты адправілі маскоўскім ліст па-польску, тыя рашуча запатрабавалі пісаць як "издавна повелось", па-беларуску. Такім чынам, беларуская мова была мовай міждзяржаўных зносін, міжнароднай мовай. Гэта азначалі і сучаснікі, у прыватнасці ў 1501 г. віленскі прэлат Эразм Вітэлі: "Летувіны маюць уласную мову. Але з тае прычыны, што русіны (беларусы) насяляюць сярэдзіну дзяржавы, усе звычайна карыстаюцца іх моваю, бо яна вытанчаная і больш лёгкая". Натуральна, што пры такіх умовах старабеларуская мова мела разгалінаваную сістэму стыляў і жанраў. Найбольш вядомымі жанрамі тагачаснай літаратуры з'яўляліся летапісы, справавая, мемуарная, мастацкая, рэлігійная, палемічная, лінгвістычная літаратура, красамоўства. Варта адзначыць, што ў богаслужэнні праваслаўныя выкарыстоўвалі царкоўнаславянскую мову, каталікі – латынь, яўрэі – старажытнаяўрэйскую мову, татары – арабскую. А з канца XVI ст. (пасля Люблінскай уніі 1569 г.) на тэрыторыі Беларусі распаўсюджваецца лацінская мова – афіцыйная пісьмовая мова на той час Польскай дзяржавы [2, с. 16, 20; 3, с. 475; 6, с. 775; 7, с. 17; 8, с. 30–31, 32, 36; 10, с. 23–24].

Адным з асноўных жанраў на той час з'яўлялася рэлігійная літаратура. Да яе належаць як перакладныя, так і арыгінальныя творы такіх славутых дзеячаў эпохі Рэнесансу, як Ф. Скарына, С. Будны і В. Цяпінскі.

Пераклад і выданне на Беларусі рэлігійных твораў у першую чаргу звязаны з асобай выдатнага гуманіста-асветніка, беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, пісьменніка, грамадскага дзеяча, прадпрымальніка, вучонага-медыка *Францыска Скарыны* (каля 1490 г. – каля 1551 г.). Заснаванне Ф. Скарынам беларускага кнігадрукавання стала вяршыняй яго духоўнай дзейнасці, найбольш выразным і яскравым пралогам беларускага адраджэння

---

[1] Назва "літвіны" стала гістарычным этнонімам беларусаў. Разам з тым існаваў і палітонім "літвіны", які азначаў дзяржаўную прыналежнасць усіх жыхароў ВКЛ.

[2] Беларуская мова – адна з найстаражытнейшых дзяржаўных нацыянальных моў Еўропы (1566). Для параўн.: англійская мова набыла афіцыйны статус у 1362 г., французская – у 1400 г.

[3] Гістарычная вобласць у Паўднёвай Румыніі, паміж Карпатамі і ракой Дунай.

першай паловы XVI ст. У друкаванай кнізе ён бачыў невычарпальныя магчымасці духоўнай асветы народа, выхавання высокіх хрысціянскіх, маральных і грамадзянскіх якасцей, далучэння нашых суайчыннікаў да еўрапейскай сацыякультурнай прасторы. Відаць, доўгія падарожжы Ф. Скарыны па краінах з развітым кнігадрукаваннем (Польшча, асабліва Італія, Чэхія і інш.), знаёмства з друкаванай кнігай, якая з канца XV ст. усё ў большых маштабах пранікала на землі ВКЛ, спрыялі яго планам, а падтрымка беларускіх мяшчан Вільні і Полацка забяспечылі іх ажыццяўленне. У адрозненне ад Польшчы, дзе ў той час значныя колы духавенства і вярхоўная ўлада не падтрымлівалі падобных праектаў (як раней і Ш. Фіёля[4] ў канцы XV ст.) і дзе існавала значная манапалізацыя друкарскай справы, больш падыходзіла для рэалізацыі планаў асветніка Чэхія. Менавіта ў заснаванай у Празе[5] друкарні (пры падтрымцы віленскіх мецэнатаў Я. Бабіча і Б. Онкава) Ф. Скарына ў 1517–1519 гг. выдаў шэраг кніг Бібліі з уласнымі прадмовамі і пасляслоўямі, у якіх патлумачыў паходжанне і аўтарства кожнай з кніг, асаблівасці іх сюжэтаў, вобразнасці і сімволікі, раскрыў значэнне Бібліі ў рэлігійным, маральным і грамадзянскім выхаванні звычайнага чалавека. Кожны раздзел кнігі ён забяспечыў анатацыяй са сціслым выкладам яго зместу. У якасці асноўнай крыніцы перакладу паслужылі чэшская Біблія 1506 г. і Вульгата (лацінская Біблія), якія асветнік старанна зверыў па старажытных яўрэйскіх арыгінальных тэкстах і іх стараславянскіх перакладах. З выдадзеных у Празе захаваліся 23 ілюстраваныя кнігі Старога Запавету пад агульным загалоўкам "Библия руска выложена доктором Франциском Скориною из славного града Полоцька, богу ко чти и людем посполитым к доброму научению". Першай з гэтых кніг быў "Псалтыр", выдадзены 6 жніўня 1517 г. У прадмове ён пісаў: "Детям малым початок всякое доброе науки". У "Псалтыры" ёсць звесткі па граматыцы, логіцы, рыторыцы, музыцы, матэматыцы: "Она [Псалтырь] пожиточный суть всякому чоловеку, мудрому и безумному, богатому и убогому, младому и старому, наиболее тым они же хотят имети добрые обычаи и познати мудрость и науку". Ф. Скарына, па сутнасці, увёў у шырокі ўжытак сярод усходніх славян новыя прынцыпы перакладу: друкаванага, ілюстраванага, зверанага па некалькіх крыніцах і забяспечанага каментарыем. Віленскія выданні асветніка 1520-х г. – "Малая падарожная кніжка" і "Апостал" – больш звязаны з традыцыйнай беларускай і ўсходнеславянскай кніжнасцю (за выключэннем некаторых дадаткаў, арнаментыкі і каментарыяў аўтара) і выдаваліся на царкоўнаславянскай мове. У Вільні Ф. Скарына ў адрозненне ад Прагі меў сваю друкарню ў доме найстаршага бурмістра Я. Бабіча каля Рынку і больш актыўна займаўся непасрэднымі друкарскімі справамі. Кнігі асветніка вылучаюцца высокімі выдавецкімі і друкарскімі якасцямі. Рэнесансавыя выданні Ф. Скарыны, адметныя мастацкім, гравюрным, арнаментальным упрыгожаннем, шрыфтам і іншымі кампанентамі выдавецкай эстэтыкі і майстэрства, былі арыентаваны на

[4] Фіёль (Fiol) Швайпольт (год нараджэння невядомы, г. Нойштат, Германія – паміж 1525 і 1526 гг.) – славянскі першадрукар, заснавальнік першай у свеце друкарні кірылаўскага шрыфту.

[5] Прага на той час з'яўлялася адным з цэнтраў еўрапейскага кнігавыдання.

ўсе пласты беларускага насельніцтва. Яны вылучаліся практычнымі памерамі, а каментарыі разлічаны на ўспрыняцце кніжнай прамудрасці простым ("паспалітым") людзям "языка рускага" (беларускай і іншых усходнеславянскіх моў). З гэтай мэтай ён тлумачыў на палях кнігі архаічныя царкоўнаславянскія словы "рускай мовай". Іншыя маргіналіі (паметы) Ф. Скарыны павінны былі падкрэсліць духоўнае адзінства Святога Пісання. З замежных, магчыма славянскіх, выданняў першадрукар запазычыў падзел псалмоў на вершы. Біблія Ф. Скарыны была другой пасля Пражскай Бібліі 1488 г., надрукаванай ва ўсім славянскім свеце. Выданні асветніка настолькі насычаны беларусізмамі, што паміж вучонымі ўзніклі рознагалоссі адносна іх моўнай асновы. Адны вучоныя лічаць яе беларускай, другія сцвярджаюць пра перавагу царкоўнаславянскай іх асновы. Аднак як бы гэта ні называлі – беларуская рэдакцыя царкоўнаславянскай мовы ці "высокі стыль" старабеларускай мовы, важна, што Ф. Скарына першы свядома сінтэзаваў у сваіх выданнях элементы мёртвай царкоўнаславянскай мовы і жывой беларускай гаворкі. На літаратурнай і мовазнаўчай ніве Беларусі асветнік распачаў тую ж самую працу, якую ў велікарускай літаратуры двума стагоддзямі пазней пачне М. В. Ламаносаў, дбаючы пра "равность" паміж кніжнаславянскай і рускай гутарковай мовамі. Моватворчую дзейнасць Ф. Скарыны можна зразумець і ацаніць на агульнаеўрапейскім фоне эпохі Адраджэння, якой паасобныя еўрапейскія мовы і абавязаны ўзыходжаннем з простых "гаворак" да ўзроўню нацыянальных моў. Нагадаем вялікіх італьянскіх гуманістаў: Дантэ, аўтара "Боскай камедыі", які першым гаворку сваёй Бацькаўшчыны – Тасканскай вобласці – імкнуўся ўзняць да агульнаітальянскай нацыянальнай свядомасці, Петрарку, Бакачыа, якія шырока спалучалі ў сваіх творах лацінскую мову з жывой народнай гаворкай. Перакладаючы Біблію, асветнік дастасоўваў беларускае слова да высокіх мерак Святога Пісання, суадносіў беларускую мову з іншымі мовамі свету – халдзейскай, яўрэйскай, лацінскай, грэчаскай, царкоўнаславянскай. Кнігі Ф. Скарыны зрабілі вялікі ўплыў на развіццё духоўнай культуры Беларусі і Украіны, стымулявалі ўзнікненне кнігадрукавання ў Маскоўскай Русі, распаўсюджваліся ў шматлікіх рукапісных копіях [1, с. 389–398; 2, с. 18; 4; 6. с. 575–582, 702; 7, с. 18–19; 8, с. 34; 10, с. 28].

Паслядоўнікам і прадаўжальнікам культурна-асветніцкіх, нацыянальна-патрыятычных і філасофскіх традыцый Ф. Скарыны з'яўляецца С. Будны (каля 1530 г. – 1593 г.) – беларускі мысліцель-гуманіст эпохі Адраджэння, рэфарматар, тэолаг, філолаг, гісторык, паэт, філосаф, педагог. Разам з Л. Крычкоўскім, К. Кавячынскім і яго братамі заснаваў Нясвіжскую друкарню, дзе ў 1562 г. выдаў на беларускай мове кнігі "Катэхізіс" і "Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам". У 1563 г. у Берасці надрукавана першая польская пратэстанцкая Біблія (т. зв. Радзівілаўская), перакладзеная з грэчаскіх і яўрэйскіх арыгіналаў, у падрыхтоўцы якой бралі ўдзел тагачасныя еўрапейскія тэолагі (І. Ласкі, Ф. Станкар і інш.). Менавіта гэта выданне паклала пачатак рэфармацыйнай біблеістыцы ў Беларусі, значны ўклад у развіццё якой зрабіў і ідэолаг польска-беларускай рэфармацыі С. Будны, выдаўшы ў 1572 г. у Нясвіжы Біблію ў польскім перакладзе. Важнейшая заслуга рэфарматара ў тым, што свой

пераклад ён ажыццявіў на новых прынцыпах, заснаваных на філалагічных метадах, а яго польскамоўны пераклад Біблii (Лоск, 1574 г.) у еўрапейскай біблеістыцы лічыўся ў свой час найбольш дасканалым [1, с. 69–76; 2, с. 18; 4; 5, с. 352–353; 7, с. 19; 8, с. 34; 10, с. 28–29].

Тытанічная дзейнасць беларускага асветніка і першадрукара знайшла таксама свой працяг у справах пратэстанцкага гуманіста-асветніка, перакладчыка, кнігавыдаўца і пісьменніка В. Цяпінскага (1530-я г. – каля 1600 г.). У 1570-я г. ён упершыню пераклаў на беларускую мову і часткова апублікаваў ва ўласнай друкарні тры Евангеллі – ад Матфея, Марка і часткова Лукі (тэксты пададзены па-старабеларуску і па-царкоўнаславянску ў паралельным размяшчэнні). У сваёй глыбока патрыятычнай прадмове (захавалася ў рукапісе) да выдання В. Цяпінскі, спасылаючыся на вопыт некаторых еўрапейскіх народаў, гаворыць пра неабходнасць перакладу Біблii на родную мову, выкладае свае погляды на жыццё, выступае як палымяны публіцыст супраць заняпаду нацыянальных пачуццяў у найвышэйшых колах грамадства, падкрэслівае ролю і неабходнасць школ [1, с. 462–463; 2, с. 18; 4; 6, с. 732–733; 7, с. 19; 8, с. 34; 10, с. 28–29].

У гэты ж час з'явіліся кітабы (ад араб. *kitab* 'кніга') – рукапісныя рэлігійныя кнігі, напісаныя па-беларуску арабскай вяззю (вядома каля 30 зборнікаў). Кітабы ствараліся з XVI ст. татарамі, што пасяліліся на тэрыторыі Беларусі і Літвы ў XIV–XV стст. і паступова забылі сваю родную мову. Лінгвістычная каштоўнасць дадзеных тэкстаў у тым, што арабскімі літарамі больш паслядоўна і выразна, чым кірыліцай, перадаюцца фанетычныя асаблівасці беларускай мовы: *аканне*, *яканне*, перадача [*г*] фрыкатыўнага, афрыкатаў [*дж*], [*дз*], мяккага [*с*] і інш. У тэкстах гэтых помнікаў назіраецца паступовы пераход ад марфалагічнага да фанетычнага прынцыпу напісання слоў. Акрамя ўласных лексем, у дадзеных помніках ёсць і беларуская фразеалогія (*галаву звесіць*, *сэрца баліць*, *чыніць паклон* і інш.) [2, с. 18; 8, с. 34; 9].

Такім чынам, рэлігійная літаратура ў Вялікім Княстве Літоўскім аказала велізарны ўплыў на ўсе сферы культурнага жыцця. У XV–XVI стст. на Беларусі распаўсюдзіўся інтэлектуальны ўплыў эпохі Адраджэння. Таму ў беларускай літаратуры (у тым ліку і канфесійнай) гэтага часу выявіліся тэндэнцыі еўрапейскага Рэнесансу. Рэлігійныя творы спрыялі развіццю старабеларускай мовы і асветы ў краіне. Менавіта з перакладаў кніг Святога Пісання распачалося кнігадрукаванне на ўсходнеславянскіх землях. Вучоныя называюць гэты перыяд "залатым векам" у гісторыі беларускай культуры, літаратуры, мовы. Творцаў таго часу можна назваць універсаламі: яны мелі энцыклапедычныя веды, дасягнулі поспеху ў розных галінах навукі і мастацтва, валодалі некалькімі мовамі, рабілі падарожжы. Вялікія мысліцелі-гуманісты Адраджэння Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі заклалі падмурак нашай нацыянальнай свядомасці, узбагацілі філасофію разважаннямі на тэалагічныя і гуманістычныя тэмы, паставілі культуру тагачасных беларускіх земляў у шэраг самых развітых сярод еўрапейскіх народаў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Асветнікі зямлі беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2001. – 492 с.
2. Асіпчук, А. М. Беларуская мова. Прафесійная лексіка : дапаможнік / А. М. Асіпчук, В. В. Маршэўская, А. С. Садоўская. – Гродна : Гродз. дзярж. ун-т, 2008. – 272 с.
3. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 2 : Беларусы – Варанец. – 1996. – 511 с.
4. Бразгуноў, А. Перакладная літаратура ў Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVIII стагоддзях [Электронны рэсурс] / А. Бразгуноў // Senoji Lietuvos Literatūra. – 2006. – № 21. – Рэжым доступу: http://www.llti.lt/failai/SLL21_Str_Brazgunoj.pdf. – Дата доступу: 15.07.2020.
5. Вялікае Княства Літоўскае: ВКЛ : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2005–2006. – Т. 1. – 2005. – 687 с.
6. Вялікае Княства Літоўскае: ВКЛ : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2005–2006. – Т. 2. – 2006. – 790 с.
7. Вялюга, С. А. Беларуская мова (прафесійная лексіка) : вучэб.-метад. комплекс / С. А. Вялюга, А. І. Зянько. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2011. – 263 с.
8. Зразікава, В. А. Беларуская мова. Прафесійная лексіка для эканамістаў : вучэб. дапам. / В. А. Зразікава, А. В. Губкіна. – Мінск : Выш. шк., 2016. – 383 с.
9. Кітабы [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабод. энцыкл. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Кітабы. – Дата доступу: 04.10.2020.
10. Старавойтава, Н. П. Беларуская мова: гісторыя і сучаснасць : вучэб.-метад. дапам. / Н. П. Старавойтава. – Мінск : Беларус. дзярж. экан. ун-т, 2006. – 182 с.

**У. А. Сенькавец**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

## ДА СЛОЎНІКА ВЁСКІ БЕЛАВУША СТОЛІНСКАГА РАЁНА

Вёска Белавуша прытулілася ў дзівосным куточку Столінскага Палесся, дзе цячэ хуткаплынная Гарынь, дзе з поўначы і поўдня раскінуліся вялікія лясы, дзе жывуць працавітыя, улюбёныя ў сваю зямлю людзі. Яны шануюць памяць пра сваіх дзядоў і клапоцяцца пра будучыню сваіх дзяцей і ўнукаў, перадаюць ім уласны вопыт, вучаць шанаваць старэйшых, паважаць дзедава слова, несці ў добры шлях бацькоўскі запавет. Белавушскае слова адметнае. Яно гучнае, напоўненае выразным "оканнем", мяккім "дзеканнем", працяглым "саканнем"… У гэтай мове актыўна ўжываюцца "русізмы", "украінізмы", "паланізмы", "германізмы", словы з іўрыта і татарскай мовы. Мова – яркі адбітак гісторыі краю, яна – адзін з паказчыкаў менталітэту людзей, іх культуры, адукацыі, поглядаў на свет і грамадства. Прывядзём невялікі слоўнік з бела-вушскай лексічнай скарбонкі. Заўважым, што вялікая частка слоўніка з прыкладамі друкавалася раней (Сенькавец, У. А. Мянушкі ў гаворцы вёскі Белавуша Столінскага раёна // Беларуская фразеалогія і еўрапейскі моўны кантэкст : зб. навук. арт. : у 2 т. / рэдкал.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2009. – С. 106–111; Сенькавец, У. А. Мікратапонімы Зарэчча